**А. А. Калтан**

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ Ў СВЯТЛЕ СЯМЕЙНАЙ ПАМЯЦІ

Для кожнага чалавека на Зямлі месца, дзе ён нарадзіўся, з'яўляецца яго маленькай радзімай. Без ведання сваіх каранёў немагчыма палюбіць свой край, родную спадчыну, стаць сапраўдным патрыётам. Без ведання свайго мінулага мы не можам марыць пра будучыню.

Я хачу апісаць гісторыю маёй сям'і праз гісторыю маёй краіны. Мой род – гэта народ. Усе гістарычныя падзеі, што адбываліся на Беларусі так ці іначай адбіліся ў лёсе маіх продкаў.

У маёй сям'і таксама ваявалі дзядуля і дзядзька маёй бабулі Марыі, мае дзяды: Юркойць Юліян Пятровіч і Адула Людвіг Іванавіч (нарадзіўся ў 1920 годзе ў вёсцы Варняны). Яны ваявалі разам – родны дзядзька і пляменнік. У адным страі прайшлі ўсю вайну. Завяршылі вайну ў Польшчы. Юркойць Юліян Пятровіч там і застаўся жыць, там ён і пахаваны. Адула Людвіг Іванавіч вярнуўся у Варняны, з вялікай колькасцю асколкаў у целе пражыў 73 гады. Пасля вайны працаваў у калгасе. Быў узнагароджаны ордэнам, шматлікімі медалямі, але насіць іх не любіў, ніколі не выхваляўся сваімі заслугамі.

З узнагародамі дзядулі Людвіга звязана адна гісторыя. Пасля яго смерці адзін з унукаў, які жыў у Вільнюсе, прасіў у яго маці (маёй прапрабабулі Адула Яніны) аддаць яму ордэн і медалі, каб выгадна прадаць. Тады прапрабабуля, не доўга думаючы, ўзяла ўзнагароды і кінула ў печ, якая якраз у той час палілася, са словамі: "Няма на свеце таго, хто іх сваёй крывёй зарабляў, не дам і прадаваць яго кроў!" Узнагароды згарэлі, а пасведчанні аб іх захоўвае мая мама.

Кожны прадстаўнік роду знаходзіць сваё месца ў ланцужку, які прадстаўляе ўладкаванне Сусвету: я – мая сям'я – мой род – мой народ – родная зямля – чалавецтва. І калі чалавек разумее гэтую непарыўную сувязь, ён стане варты свайго роду. Бо людзі жывуць на гэтым свеце, каб перадаць часцінку сябе нашчадкам, каб захаваць сябе ў будучых пакаленнях.

Першая ўмова закону вечнасці – каб унукі ведалі, хто такія іх дзяды, каб помнілі і бераглі, як зрэнку вока, створаную імі і пакінутую ў спадчыну, духоўную і матэрыяльную маёмасць. Бо людзі жывуць на гэтым свеце, каб перадаць часцінку сябе нашчадкам, каб захаваць сябе ў будучых пакаленнях.